ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

20 лістапада 1931 г.
№ 2[illegible] (1537)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Растуць колены перадавікоў

Усьлед за комсамольцамі „Комунара“ на перадавыя лініі выйшлі колектывы „Бальшавіка“, „Варашылава“ і „Кастрычніка“

Адстаючым хутчэй падцягнуцца

Да пленуму Менгаркому ЛКСМБ

Кастрычнік м-ц зрабіў рашучы пералом у рабоце менскай прамысловасьці. Рад заводаў і фабрык ня толькі выканалі, але перавыканалі свой прамфінплян.

Так, завод „Бальшавік“ прамфінплян за кастрычнік у колькасных паказчыках выканаў на 106,98 проц., а ў якасных на 122,8 проц. Завод „Комунар“, які 3-ці квартал закончыў з вялікім прарывам (на 72 проц. выканаў прамфінплян) у кастрычніку дабіўся 97,4 проц. Чырвонаштандарная фабрыка „Кастрычнік“ у 3-м квартале выканала свой прамфінплян толькі на 98 проц., а ў кастрычніку на 102 проц. Выканалі свой прамфінплян фабрыкі: „8-е сакавіка“, і ім. Крупскай, рымарная і інш.

Гэтых посьпехаў пролетарыят Менску дабіўся дзякуючы ажыцьцяўленьню гістарычнай промовы тав. Сталіна.

Комсамольская організацыя горада, уключыўшыся ў сталінскую пуцёўку, разам з партыяй білася за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну як па колькасных, так і па якасных паказчыках.

Барацьба раду комсамольскіх колектываў гораду за выкананьне прамфінпляну па ўсіх яго паказчыках цесна ўвязвалася з барацьбой за 100 проц. рабочай моладзі ў комсамол. Так, на заводзе „Бальшавік“ з 169 чал рабочай моладзі ў комсамоле 157. На фабрыцы „Кастрычнік“ з 490 чал. рабочае моладзі—у комсамоле 411. У колектыве Цягі з 190 чал—у комсамоле 152. На заводзе „Комунар“ 97 проц. рабочае моладзі ў комсамоле.

Навічкі конкрэтнымі справамі даводзяць сваё ўменьне змагацца на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва.

Рад колектываў і ячэек (шклозаводу „Пролетары“, Аўтотрамтрэсту, гарнай, абутковай фабрыкі і інш. прыходзяць аднак к пленуму з вялікім прарывам у рэалізацыі пуцёўкі

Гэтыя колектывы не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі соцыялістычнага будаўніцтва.

Трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што сталінская пуцёўка ў вясковай частцы організацыі разгортваецца вельмі дрэнна.

Нельга абыйсьці моўчкі таксама той факт, што барацьба за выкананьне ўсіх 6 умоў т. Сталіна на радзе фабрык і заводаў разгортваецца нераўнамерна.

Пленум павінен будзе рашуча выраўнаць фронт у барацьбе організацыі за рэалізацыю ўсіх маршрутаў сталінскай пуцёўкі.

Пленум павінен забясьпечыць мобілізацыю масы комсамольцаў і рабочае моладзі на рэалізацыю ўказаньняў т. Сталіна к 4-му кварталу.

Выраўнаць фронт удзелу комсамольцаў у барацьбе за тэхнічную інтэлігенцыю, за організаваны набор рабочае сілы, за палапшаньне бытавых умоў

Пленум павінен дабіцца рашучага пераломy ў рэалізацыі сталінскай пуцёўкі на вёсцы. Барацьба за гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, за выкананьне пляну загатовак і разгортваньне соцыялістычнай жывёлагадоўлі—вузлавыя пытаньні, вакол якіх трэба сконцэнтраваць увагу комсамольскіх ячэек саўгасаў і колгасаў.

Праз рэалізацыю 6 гістарычных ўказаньняў тав. Сталіна менская комсамолія павінна дабіцца выкананьня і перавыкананьня пляну 4-га кварталу. Факт пастаноўкі пытаньня аб рэалізацыі сталінскай пуцёўкі і аб пераключэньні яе ў сталінскі паход абвешчаны „Комсомольской правдой“, мае вялізарнае значэньне. Іншыя організацыі павінны ўзяць прыклад з менскай комсамолії.

Адзін з лепшых

Завод „Бальшавік“ з кварталу у квартал пераходзіць з перамогамі у выкананьні прамфінпляну як па колькасных, так і па якасных паказчыках. За 3-й квартал прамфінплян па колькасьці выканан на 104,54 проц, па кошту на 110,8 проц, За кастрычнік месяц прамфінплян па колькасьці выканан на 106,98 проц. па якасьці на 122,8 проц.

Згодна прамфінпляну завод павінен быў зьнізіць сабекошт на 5,89 проц., а зьнізіў на 14,13 проц, Вытворчасьць працы за 3-ці кв. узьнялася на 21.32 проц

Для барацьбы з бракам колектыў комсамолу організаваў пасты якасьці, працуюць 2 брыгады якасьці, у конвэерных цэхах праводзіцца конвэер якасьці.

Пры дапамозе і ўдзеле комсамольцаў 29 брыгад праводзяць 10-ці хвілінныя сустрэчныя нарады, дзе абгаварваюцца пытаньні якасьці.

Сіламі комсамольскага колектыву за 3-ці квартал па заводзе сабрана 136 рабочых прапаноў, у кастрычніку сабрана 52, што дало эконамічны эфэкт у 6 тыся рублёў. На заводзе існуюць 4 плянава-опэрацыйныя групы.

З агульнай колькасьці рабочых заводу 91 проц. ахоплены ўдарніцтвам. Да промовы Сталіна толькі 67 проц. рабочых заводу былі ахоплены ўдарніцтвам, зараз налічваецца 72 ўдарныя брыгады. За апошні час лік ўдарнікаў павялічыўся на 60 чал.

На гаспадарчы разрахунак пераведзены 4 цэхі. Па асноўных цэхах пераведзена на гаспадарчы разрахунак 13 брыгад. За апошнія дні сіламі комсамольскага колектыву пераведзена яшчэ 6 брыгад. З агульнае колькасьці 18 гаспадарча-разрахунковых брыгад—3 маладзёжныя. Маладзёжная брыгада 2-га хромавага цэху дабілася 1875 р. экономіі за кастрычнік.

Гаспадарча-разрахунковая брыгада рамшчыкаў 1-га хромавага цэху прамфінплян выканала на 115 проц., комсамольцы гэтага-ж цэху—на 122 проц.

Брыгада рамшчыкаў 2-га хромавага цэху прамфінплян выканала на 117 проц, комсамольцы гэтай брыгады—на 128 проц

Брыгада стругалёў 2-га хромавага цэху прамфінплян выконвае на 126 пр., а комсамольская брыгада стругалёў—на 154 проц.

У галіне барацьбы за тэхніку колектыў мае ня мала дасягненьняў. У савпартшколах, дзе выкладаюцца тэхнічныя прадметы, навучаецца 255 рабочых. Акрамя гэтага, на заводзе працуюць курсы кваліфікацыі, дзе займаецца каля 20 чал., курсы скурсыравіцеляў, праз якія прапушчана вялікая колькасьць рабочых. 3-ці выпуск даў 30 чал. з іх—8 комсамольцаў.

На прогрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну пераведзена 7 брыгад. Брыгада выпарвальшчыкаў дала рост вытворчасьці за верасень на 22 проц. Усіх комсамольцаў у гэтых брыгадах 13 чал.

На пытаньні ўраўнілаўкі комсамольцы шмат чаго зрабілі.

На заводзе вылучана 10 вядучых професій, якім перабудавана зарплата на павышэньне. Калі раней стругаль 6-га разраду зарабляў 7-8 р. цяпер ён зарабляе 9-10 р. у дзень.

У нас машыны маюць зараз сваіх гаспадароў, кожны рабочы прымацован да сваёй машыны.

Работа ЗРК за апошні час значна перабудавана. У складзе праўленьня 3 комсамольцы. Сталовая заводу, перабудаваўшы сваю работу, дабілася 100 проц. і своечасовага забясьпечаньня рабочых абедамі.

У сталоўцы уведзен сьмініміум, бракераж продуктаў і г. д. Ідзе падрыхтоўчая работа па пераводу сталоўкі на гаспадарчы разрахунак.

Разам з разгортваньнем барацьбы комсамольскага колектыву за выкананьне 6 указаньняў т. Сталіна расьлі рады комсамолу: з 169 чал. рабочай моладзі—157 ў комсамоле. За час конкурсу на лепшы колектыў прынята ў комсамол 26 чал., перададзена ў партыю 14 чал. Навічкі комсамольцы паказваюць лепшыя ўзоры барацьбы за прамфінплян. Комсамольская брыгада стругалёў, дзе вялікая колькасьць навічкоў, свой прамфінплян выконвае на 130 проц. Гэтая брыгада—лепшая на заводзе. Ініцыятарамі пераводу на гаспадарчы разрахунак брыгад спрыцапарадчыкаў і красільшчыкаў 2-га хромавага цэху зьяўляюцца комсамольцы-навічкі.

Усіх гэтых посьпехаў колектыў дабіўся дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыйнага колектыву і пераносу ўсёй сваёй работы ў групы і брыгады.

І

„Са сталінскай пуцёўкай—перамагаем“

К пленуму гаркому ЛКСМ колектыў заводу Варашылава прыходзіць са значнымі посьпехамі па рэалізацыі сталінскай пуцёўкі на прадпрыемстве. Прамфінплян на кастрычнік месяц выканан на 90 проц. Сабекошт зьніжан за 3-ці квартал на 11,5 проц. Брак складае 6,88 проц.

Комсамольскі колектыў прыняў цэлы рад мерапрыемстваў па барацьбе з бракам. Падэкадна вывешваліся сьпісы на чырвоную і чорную дошку: лепшых і горшых ў барацьбе з бракам. Організован тэхнічны гурток па вывучэньню прычын браку. Дзякуючы гэтым мерапрыемствам, мы дабіваемся яшчэ большага зьніжэньня браку.

На гаспадарчы разрахунак пераведзены 4 цэхі, 19 брыгад, 16 варштатаў і ўсе маладзёжныя брыгады.

У комуне імя „Ч. З.“ ліквідавана ўраўнілаўка і абязьлічка, кожны рабочы прымацован да адпаведных варштатаў і інструмантаў. Комуна і комсамольская брыгада кацельнага цэху пераведзены на прогрэсыўна-прэміяльную аплату працы. Комсамольскі колектыў прыняў актыўны ўдзел у палепшаньні культурна-бытавых умоў рабочых. Адрамантавана сталоўка з буфэтам. Зараз прыступілі да організацыі буфэту ў кацельным цэху. Якасьць абедаў значна палепшылася. Плян нарыхтовак па ЗРК перавыканан, што дае магчымасьць поўнасьцю забясьпечыць рабочых і дабіцца яшчэ лепшай якасьці харчаваньня ў сталоўцы.

Організавана пры заводзе агульнажыцьцё Зараз правялі капітальны рамонт памяшканьня, набыты для ўсіх жалезныя ложкі і матрацы.

Замест ранейшых асобных тэхнічных гурткоў організаваны вучэбна-тэхнічны комбінат, дзе навучаецца 274 рабочых. У комбінаце організаваны некалькі груп спэцыяльна для навічкоў рабочых, дзе яны павышаюць сваю кваліфікацыю. Гэтых посьпехаў мы дабіліся, дзякуючы таму што перанесьлі ўсю работу ў групу.

Ёсьць у нас недахопы: яшчэ зусім мала комсамольцаў пераведзена на прэміяльна-прогрэсыўную аплату, паасобныя гаспадарча-разрахунковыя брыгады працуюць яшчэ ня зусім добра, вайсковая работа таксама яшчэ слаба пастаўлена.

Зараз мобілізоўваем усе свае сілы на яшчэ лепшую рэалізацыю сталінскіх маршрутаў.

Скробат.

Мал. мастака Кругер.



Т. Гурэвіч організатар камуны імя „Чырвонай Зьмены“ (завод Варашылаў, Менск)

Шырэй політмасавую работу вакол збожжазагатовак

Раўнаньне па комсамоліі Дэмбіцкага і Вендараўскага сельсаветаў, якія дабіліся перавыкананьня плянӑў!

ЦК ЛКСМБ констатуючы ў сваёй пастанове ад 3—XI нездавальняючы ўдзел раду організацый у нарыхтоўках, прапанаваў „шырока разгарнуць масава-політычную работу вакол нарыхтоўчай кампаніі, забясьпечыўшы пагалоўны ўдзел усіх комсамольцаў у барацьбе за пасьпяховае выкананьне плянӑў“.

Зьмешчаныя допісы з Барысава, Шклова, Любані сыгналізуюць аб невыкананьні гэтай пастановы і адсутнасьці рашучага адпору спажывецкім, рвацкім тэндэнцыям паасобных колгасаў і стаўцы клясавага ворага на зрыў плянӑў.

Посьпехі комсамоліі Дэмбіцкага і Вендараўскага с-с, якія дабіліся перавыкананьня пляну, павінен множыць увесь ЛКСМБ.

Узьняць масава-політычную работу

Асавецкі сельсавет, Любанськага раёну, ганебна зрывае нарыхтоўкі Плян збожжа выканан на 5 лістапада ўсяго толькі на 25 проц., з бульбай яшчэ горш—на 20 проц. Сельсавет недаацэньвае нарыхтоўку льна-валакна, плян выканан на 1 проц. Кулацка-заможная частка саботуе цьвёрдыя заданьні. Паасобныя члены сельсавету з вёсак Пеклічы і Плюсна хадайнічаюць аб тым, каб зьняць з заможнікаў цьвёрдыя заданьні, дадзеныя сельсаветам.

Комсамольскія ячэйкі Асавецкага сельсавету павінны ўдарыць па зрыўшчыках нарыхтовак, узьняць масава-растлумачальную работу, організаваць магутныя чырвоныя абозы выконваць плян нарыхтовак.

Новік Янка.

Даць дапамогу колгасу „Будзёнавец“

У колгасе „Будзёнавец“ (Полацкі раён) не праведзена падрыхтоўчая праца да разьмеркаваньня ўраджаю, дзякуючы чаму авансы колгасьнікам выданы не па працаднёх, а па едакох. Сена разьмеркавана па кулацкаму прынцыпу:—усім пароўну. На кожную неабагуленую карову прышлося па 800 клг. сена.

Комсамольская ячэйка комуны „Чырвоны артылерыст“, павінна дапамагчы колгасу „Будёнавец“ выправіць памылкі ў разьмеркаваньні ўраджаю і дабіць кулацкую ўраўнілаўку.

Віленскі.

Плян збожжазагатовак выканан на 109 проц.

Сельком ЛКСМ пры колгасе „Сталіна“ (Вендараўскі с-с, Магілеўшчына) дасягнуў значных посьпехаў у нарыхтоўках. Ячэйкі склалі ўдарныя брыгады па загатоўцы і пагрузцы бульбы ў вагоны, організоўвалі чырвоныя абозы, дзякуючы чаму плян адгрузкі бульбы пролетарскім цэнтрам Ленінграду і Маскве выканан своечасова і больш як на 100 проц.

Плян збожжа выканан на 109 проц., набліжаюцца да 100 проц. пляны мяса і інш. відаў загатовак.

Несьцяровіч.

Дэмбіцкі с-с у авангардзе

БАРЫСАЎ. У Барысаўскім раёне гадовае заданьне па збожжазагатоўках на 10 лістапада выканана на 53,5 проц. Такія тэмпы ні ў якім разе не забясьпечваюць выкананьня пляну ў вызначаны тэрмін. Перасадзкі сельсавет выканаў гадовае заданьне на 25 проц., кулацка-заможная частка—на 29,3 проц.

Чарневіцкі сельсавет выканаў 20 проц. гадавога заданьня, а кулацка-заможныя гаспадаркі толькі 9,5 проц., Лешніцкі сельсавет—14 проц. кулацка-заможныя—52 проц.

Азяціцкі і Бяляціцкі сельсаветы выканалі плян збожжазагатовак толькі на 7 проц. Прыклад бальшавіцкай барацьбы падае Дэмбіцкі сельсавет, які выканаў плян збожжазагатовак на 116,1 проц Рад іншых сельсаветаў таксама набліжаецца да 100 проц. выкананьня

Адстаючыя сельсаветы, партыйна комсамольскія ячэйкі абавязаны мобілізаваць шырокія масы колгасьнікаў і аднаасобнікаў беднякоў і серадняков на своечасовае выкананьне збожжазагатовак.

БЕЛТА.

У глыбокім тыле сталінскага походу

Рэалізацыя сталінскай пуцёўкі зьяўляецца неабходнай і галоўнейшай умовай пасьпяховага скончэньня 3-га рашаючага і падрыхтоўкі да 4-га заключнага году пяцігодкі І менавіта за гэтым мае выключна політычнае значэньне дагавор, заключаны профсаюзамі Беларусі і Заходняй вобласьцю на рэалізацыю 6-ці ўказаньняў т. Сталіна. Роля комсамольскай організацыі ў выкананьні гэтых дагавароў мае выключнае значэньне.

Аднак, паасобныя колектывы гэтага не зрабілі і мала чаго конкрэтна зразумелі для рэалізацыі сталінскай пуцёўкі. Вось чаму на фабрыцы „Ўсход“—прарыў у прамфінпляне. На 3 квартал прамфінплян выканан на 79,4 проц., а за кастрычнік фабрыка аказалася ў глыбокім тыле, выканаўшы плян усяго на 69,2 проц.

Комсамольскі колектыў ня ўзяўся за рашаючыя галіны работы, аб чым яскрава гаворыць факт, што з 1100 рабочых соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплена ўсяго 520 ч. Комсамольскі колектыў не толькі не зьяўляецца ініцыятарам соцспаборніцтва і ўдарніцтва, а наватня выканаў яшчэ рашэньня зьезду КСМ аб стопроцантным ахопе комсамольцаў спаборніцтвам і ўдарніцтвам: з 250 комсамольцаў ударнікамі зьяўляюцца каля 200 чал.

Гаспадарчы разрахунак яшчэ ня стаў вагаром палепшаньня работы на фабрыцы. Комсамольскі колектыў упусьціў гэтую работу. З 9 маладзёжных брыгад на гаспадарчы разрахунак пераведзены ўсяго... 2 брыгады.

Прэміяльна-прогрэсыўная зьдзельшчына на фабрыцы ня ўжываецца Гора-кіраўнікі ўсё яшчэ „падрыхтоўваюцца“.

Комсамольскі колектыў мае цэлы рад глыбокіх прарываў у сваёй рабоце. З 400 чал. рабочае моладзі—у комсамоле 250 чал. Культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых выпала з-пад увагі комсамольскага колектыву.

Работа колектыву не забясьпечвае выкананьне пастаўленых задач. Менгарком комсамолу абавязан прыняць меры для аздараўленьня гэтага колектыву.

Г.

На выклік баўманскіх стралкоў

Комсамольскі колектыў Полацкага лясного тэхнікуму на выклік баўманскіх стралкоў уключыўся ва ўсесаюзны конкурс.

Па тэхнікуму абвешчан конкурс на лепшага стралка, вылучаны 3 агульныя прэміі і адна прэмія лепшаму стралку-комсамольцу.

Цір штодзённа ў вызначаны час напоўнен комсамольцамі і беспартыйнымі студэнтамі.

Тайбэль.

Паставіць жывёлу ў цёплае стойла, даць добры корм і ваду,

праверыць падрыхтаванасьць абор і сьвінарнікаў к зіме, забясьпечанасьць іх кармамі і вад[ой]

ПРЫКЛАСЬЦІ ЎСЕ СІЛЫ, КАБ У НАЙКАРАЦЕЙШЫ ТЭРМІН ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН СІЛАСАВАНЬНЯ

Зябліць па-ўдарнаму

Зіма не за гарамі

Рагачоў. Плян зяблівага ворыва выканан па раёне на 10 лістапада на 36 проц. Колгасы выканалі свой плян на 54 проц. і аднаасобнікі на 26.

Партыйныя комсамольскія ячэйкі і сельсаветы не вядуць масавай работы вакол зябліва, з-за чаго апошняя дэкада дала зусім нездавальняючы процант росту ў выкананьні пляну (1,7 проц,)

Кіраўнікі паасобных колгасаў недаацэньваюць гаспадарчага значэньня зябліва. Колгасы „Чырвоны Грабаў“. „Слабада“ і інш., выканаўшы плян ня больш чым на 50 проц, зараз зусім спынілі ворыва.

Комсамольскія ячэйкі гэтых колгасаў ня ўжылі ўдарных тэмпаў. На зяблівае ворыва не перакінута ўся вольная цягавая сіла.

Трэба выканаць дырэктыву партыі і перакінуць зяблівае на ўсю цягавую сілу.

Р-у

Гаварылі на сходах праўсё
—толькі не пра жывёлагадоўлю

Колгас „Чырвоная Беларусь“ (Жлобінскі раён) у красавіку 1931 году організаваў малочную таварную фэрму. Згодна пляну, к канцу 1931 году фэрма павінна была давесьці пагалоўе малочнай жывёлы да 160 шт., маладняка 50 шт., здаць дзяржаве 337 цэнтнэраў малочнай продукцыі. Гэты плян ня выканан. На сёньня фэрма налічвае толькі 41 карову і 40 штук маладняка. Пляна здачы продукцыі выканан усяго на 40 проц. Большасьць малака колгас разбазарвае.

Каровы знаходзяцца ў надзвычай дрэнных умовах. Фэрма пабудавала кароўнік, але чамусьці скарыстала яго пад канюшню, а каровы стаяць у разбураных халодных хлявах ля чорава у гразі. Надсьцілка даецца раз у месяц.

Догляд жывёлы не пераведзен на зьдзельшчыну, абязьлічка не ліквідавана. Праўленьне колгасу не зьвяртае ўвагі на жывёлагадоўлю. Міхно з членаў праўленьня не наведвае аборы. Таксама і комсамольская ячэйка жывёлагадоўляй займаецца ад выпадку да выпадку. Ячэйка не падумала аб тым, каб ацяпліць кароўнік к зіме, пабудаваць кармушкі, забясьпечыць кароў вадою. Ужо зараз каровы стаяць ня поеныя, ніводнага комсамольца ня вылучыла ячэйка для догляду за жывёлай, бо лічыць гэту работу нікчэмнай.

Трэба зараз-жа ўключыцца ў спаборніцтва за організаваную сустрэчу зімы, каб нагнаць прапушчанае.

Фіялкін, Чаўшкін.

Вынік пакуль што дрэнны

Мінула больш 3-х дэкад, як Стара-Дарожскі раён абвясьціў вытворчыя манэўры, каб хутчэй скончыць будаўніцтва сьвінарнікаў, абор і комплектаваньне гурту.

За час манэўраў трэ' было пабудаваць 11 сьвінарнікаў на 1100 сьвінаматак. Аднак, за 3 дэкады штурму скончана будаўніцтва толькі аднаго сьвінарніка на 100 сьвінаматак.

Сьвінное пагалоўе за час манэўраў павялічылася толькі на 35 штук.

Колгасы „Чырвоны рухавік“ і Фрунзэ будаўніцтва сьвінарнікаў сарвалі.

Крыху лепш ідзе комплектаваньне малочна-таварных фэрм. За час вытворчых манэўраў у МТФ пастаўлена 600 кароў (плян перавыканан на 5 кароў)

Манэўры не далі ніякага зруху ў выкананьні плянаў сілосаваньня: раённы плян выканан усяго на 48,5 проц. Колгасы „Чырвоная гвардыя“, „Ударнік“ і „Чырвоная дуброва“ зусім сарвалі сілосаваньне. У колгасе „Бальшавік“, з-за галавацянства старшыні колгасу гр. Сойкі, які ня даў для сілосаваньня патрэбнай колькасьці рабочае сілы, нарыхтаваная сілосная маса згноена.

Няма ніякага зруху ў комплектаваньні цялячых фэрм. За час манэўраў гурт цялят не павялічыўся ні на адну галаву.

Комсамольская організацыя слаба ўдзельнічае ў манэўрах. Райком комсамолу не забясьпечыў опэрацыйнага кіраўніцтва ячэйкамі. Большасьць ячэек зусім бязьдзейнічае.

Стара-Дарожскі райком комсамолу абавязан ужыць энэргічныя меры, каб мобілізаваць усю комсамольскую організацыю на ажыцьцяўленьне сталінскай пуцёўкі комсамолу і падрыхтоўку жывёлы к зіме. М. М.

Карова прыбуджан[а] зімаваць пад адкрыт[ым] небам

Саўгас імя Лекерта (Менскі [раён]) павінен быў к 1-му кастрычні[ка] пабудаваць дзьве аборы на 100 [га]лоў буйнай рагатай жывёлы і 2 [абор]ы штук маладняка. Будаўніцтва гэтых абор распачата яшчэ з вясн[ы], аднак з-за нерасьпарадчасьці кіраў[ніцтва] саўгасу і дрэнной органі[зацыі] работы аборы яшчэ ня с[кон]чаны. Жывёла на час стойла [illegible] зімоўкі. Плян будаўніцтва выкана[н] усяго на 25 проц. Трохвутнік с[аў]гасу не прымае энэргічных [мер], каб узяць тэмпы будаўніцтва.

Саўгас не выказаў плян комплектаваньня гурту. У аддзяленьні Вясёлаўка трэ' было мець 200 [ма]лочных кароў—ёсьць 190, у [illegible]ноўн—100, ёсьць 40.

Кармавая база пад жывёлагадоўлю не падведзена, плян сіласаваньня [illegible] ня выканан. У аддзяленьні Весялоўка замест 700 тон засіласавана 600. У Ясноўцы замест 300—[illegible]

6 умоў т. Сталіна ў саўгасе [не] ажыцьцяўлены. Не ўвадзена [illegible] зьдзельная сыстэма аплаты, ня выкаранена абязьлічка.

Комсамольская ячэйка нічога не зрабіла, каб папраўдзіць гэтыя прарывы: па ўсесаюзнае спаборніцтва па падрыхтоўцы жывёлы да з[імы] і ажыцьцяўленьне сталінскай [ком]самольскай пуцёўкі не ўключыла[ся].

На [illegible] налы „Чырвонай Зьмены“ аб [illegible] будаўніцтва і дрэнай рабоце [ком]самольскай ячэйкі, ні Менскі [рай]ком комсамолу, ні ячэйкі ня ўж[ылі] ніякіх канкрэтных захадаў, каб [illegible] сова падрыхтаваць аб[ору] да зімо[ўкі] жывёлы.

Трыхкутнік саўгасу і комсамольская ячэйка абавязаны ў бліжэйшыя дні скончыць будаўніцтва абор і паставіць жывёлу ў цёплыя добра агледжаныя аборы.

Ударнік

Выраўніць фронт у рэалізацыі загаду тав. Андрэева

Загад т. Андрэева разам са сталінскай пуцёўкаю сталі разгорнутай праграмай работы комсамольскага колектыву заводу „Полымя рэвалюцыі“. Усе гэтыя матар'ялы былі прапрацаваны на комсамольскіх сходах, цэхавых і групавых. У сувязі з загадам т. Андрэева завод пераведзен на новую тарыфную сетку. Зараз завод пераведзен на 87-90 проц. на зьдзельшчыну, зьліквідавана ўраўнілаўка, якая панавала на заводзе і зрывала прамфінплян.

У выніку пераходу на зьдзельшчыну за кастрычнік месяц завод выканаў прамфінплян на 103 проц. За першую дэкаду лістапада некаторыя цэхі таксама выканалі свой прамфінплян.

Пры ліквідацыі ўраўнілаўкі дабіліся лепшых посьпехаў у сваёй рабоце па выкананьні прамфінпляну комсамольскія брыгады: імя „17-га МЮДу“, Лапіна і Гарачуна.

Да ўсіх варштатаў прымацаваны сталыя рабочыя, але не ўсюды ліквідавана абязьлічка. Асабліва гэта наглядаецца ў прымацаваньні паасобных дапаможных інструментаў да сталых брыгад вагоншчыкаў. У гэтым напрамку мала чаго зрабіла ячэйка таварнікаў.

У сувязі з падрыхтоўкай да вузлавой конфэрэнцыі комсамолу заводскім будуць організаваны 6 комсамольскіх варштатаў.

Адзін з галоўных цэхаў заводу—сталоўка была ў вельмі дрэнным стане. Комсамольскі колектыў узяў шэфства над сталоўкай і перагледзеў яе [illegible]. Вылучаныя брыгады правялі рэйд на кухню. У выніку кіраўніцтва сталоўкі было абноўлена. Зараз сталоўку не пазнаць. Яна зьяўляецца перадавою на вузьле.

Колектыў імкнецца ўвесь час стварыць вытворча-бытавую комуну але ніяк не можа дабіцца памяшканьня, ніхто ў гэтым не аказвае ніякай дапамогі.

Сталінскі паход даў велізарны зрух у пераводзе заводу на гаспадарчы разрахунак. За лістапад месяц пераведзена 13 брыгад, з якіх 3 комсамольскія. Вядзецца напружаная работа па пераводу к 1-му сьнежня яшчэ 5 новых комсамольскіх брыгад.

Пераведзеная на гаспадарчы разрахунак комсамольская брыгада Дарашэвіча за першую палову лістапада выпусьціла звыш нормы 2 вагоны.

Вытворчая работа непарыўна зьвязана з барацьбой за акомсамольваньне заводу. Весь лічбы ясна паказваюць барацьбу колектыву за шматлікасьць комсамол: к 1-му чэрвеня была толькі адна ячэйка з 34 чал., к 1-му жніўня—з 78, а на сёньня—150 чал., з якіх 22 чал. прыняты ў дзень сьвяткаваньня 14 гадавіны кастрычніка.

На заводзе па-за комсамолам толькі 32 чалавекі. Па замацаваньню новапрынятых у комсамол праводзяцца 2 спэцыяльныя гурткі. Навічкі атрымліваюць канкрэтныя нагрузкі.

Аднак колектыў мае велізарны прарыў у галіне аўладаньня тэхнікай разгортваньня рацыяналізатарскага руху, барацьбы за кадры і г. д.

С.

Перабудова комсамольскай работы на вытворчасьці і роля групы

На аснове 6 указаньняў т. Сталіна ва ўсёй сыстэме кіраўніцтва прадпрыемствамі праходзіць перабудова работы: перавод на гаспадарчы разрахунак, рэформа новай сыстэмы крэдытаваньня, ліквідацыя абязьлічкі, ўраўнілаўкі і г. д.

Перабудова работы не зьяўляецца самамэтай—„асноўны прынцып організацыйнай практыкі партыі і комсамолу—гэта падпарадкаваньне організацыйнай практыкі партыі яе політыцы“. Адсюль зразу мела, што наша організацыйная практыка павінна мяняцца і мяняецца ў адпаведнасьці з політычнымі задачамі пэрыоду.

Асноўнае—у перабудове

Цэнтральныя пытаньні работы прадпрыемства зараз вырашаюцца і залежаць ад работы брыгад і груп. Выкананьне прамфінпляну, зьмяншэньне браку, аўладаньне тэхнікай—усё гэта ўпіраецца ў нізавую вытворчую організацыю, брыгаду і групу. Адсюль і работа комсамольскай організацыі прадпрыемства залежыць ад работы зьвеньняў і груп. Асноўным і галоўным ва ўсёй перабудове комсамольскай работы на прадпрыемствах—гэта перанясеньне цэнтру цяжару работы ў групу і палепшаньне яе зьместу. Другой умовай перабудовы зьяўляецца дыфэрэнцыяцыя (разьдзяленьне) работы комсамольскіх камітэтаў, колектываў па галінах работы—пераход на сэктарную сыстэму работы, з асабістай адказнасьцю кожнага сябра камітэту, колектыву, ячэйкі за адпаведную галіну работы.

Організацыя комсамольскай групы

Комсамольская група організуецца па вытворчаму прынцыпу і ахоплівае комсамольцаў, якія працуюць на паасобных вучастках цэху, агрэгату і брыгады па опэрацыях вытворчасьці. Лепш за ўсё групу організаваць ня больш з 8-10 чалавек. Комсамольская група зьяўляецца часткай ячэйкі і працуе пад непасрэдным кіраўніцтвам бюро ячэйкі. На прадпрыемствах, якія працуюць у 2-3 зьмены, неабходна організаваць зьменныя брыгады, што мае выключнае значэньне, бо яшчэ дагэтуль уплыў комсамолу ў начных зьменах недастатковы. У групе кожны комсамолец абавязкова павінен мець якую-небудзь канкрэтную нагрузку.

Асноўная работа і задача групы

Рашаючым у рабоце групы зьяўляецца забясьпечаньне выкананьня прамфінпляну і плянавых заданьняў вытворчай адзінкі, дзе працуе група. Кожны комсамолец у групе абавязан ведаць свой плян па ўсіх паказчыках. Ва ўсіх выпадках невыкананьня пляну група за гэта адказвае; яна абавязана вывучаць прычыны прарыву і ставіць пытаньне перад адміністрацыяй і вышэйшымі організацыямі аб прыняцьці мерапрыемстваў па палепшаньню работы.

Група адыгрывае вядучую ролю ў разьвіцьці спаборніцтва, ударніцтва і ў першую чаргу абавязана змагацца за 100 проц. ахоп комсамольцаў і рабочай моладзі спаборніцтвам. Асаблівая ўвага пры гэтым павінна быць зьвернута на навічкоў. Абавязкам групы зьяўляецца сыстэматычная праверка ходу спаборніцтва і якасьці работы ўдарнікаў:—як яны выконваюць узятыя на сябе абавязкі, як пастаўлена працдысцыпліна, ліквідацыя браку, вывучэньне тэхнікі і г. д.

Група праводзіць сыстэматычна настойлівую работу па пераводу спаборніцтва на вышэйшыя формы. Цяпер для комсамольца быць толькі ўдарнікам мала. Зараз кожны ўдарнік павінен быць актыўным рацыяналізатарам, плянавіком свайго цэху, брыгады і прадпрыемства. Плянаваньне—адно з цэнтральных пытаньняў работы прадпрыемства. Таму група цалкам абавязана абгаварваць пытаньні плянаваньня свайго цэху або брыгады, высоўваючы сустрэчныя пляны.

У задачу групы ўваходзіць організацыя тэхвучобы і ў першую чаргу павышэньне тэхузроўню комсамольцаў групы. Пры гэтым неабходна ўзяць за аснову вывучэньне процэсаў свайго работы, дзеля чаго група організуе тэхгурткі, або іншыя формы. Карысна і неабходна прыцягваць для тэхнічных гутарак інжынэраў, тэхнікаў, старых кваліфікаваных рабочых, напрыклад, па пытаньнях вывучэньня прычын браку, вывучэньня варштата і інш. Задача ў тым, каб атрыманыя ад гэтых гутарак веды заўтра-ж ужываліся ў процэсе вытворчасьці. Група абавязана дабіцца на процэсе сваёй работы вывучэньня і пашпартызацыі варштатаў. Кожны варштат павінен мець свой пашпарт, гэта зн., што працуючы на варштаце павінен ведаць яго продукцыйную здольнасьць, важнейшыя часткі і г. д. У групе таксама рашаюцца пытаньні росту, адсюль уся работа па ўцягненьню рабочай моладзі ў спаборніцтва і ўдарніцтва павінна садзейнічаць ажыцьцяўленьню лёзунгу: 100 проц. рабочай моладзі—у КСМ.

Важнейшым пытаньнем работы групы зьяўляецца пастаноўка політвучобы, ахоп ёю ўсіх комсамольцаў і рабочай моладзі. Роль групы ў гэтым тым большая, што асноўнай задачай у політвучобе зьяўляецца ўвязка яе з задачамі вытворчасьці.

Для практычнай рэалізацыі гэтых задач патрабуецца расстаноўка комсамольскіх сіл, каб забясьпечыць комсамольскі ўплыў на рашаючых, вытворчых вучастках свае[й] брыгады.

Такавы задачы групы.

Мэтоды работы групы [і] роля групоргаў

Асноўным мэтодам работы груп[ы] павінна быць канкрэтная распрацоўка пытаньняў і прапаноў. Напрыклад, не агульны даклад аб рос[ь]це,—а як уцягнуць такую-то групу ў комсамол, не агульна гаварыць аб зьніжэньні браку, а чаму такі-то комсамолец робіць брак і як яму дапамагчы зьнішчыць гэт[а].

Работа групы ў значнай меры залежыць ад групорга. Групорг зьяўляецца організатарам і кіраўніком групы. Аднак, гэта не азначае, што групорг павінен усё сам зрабіць, падмяняючы комсамольцаў. Групорг абавязан разьмеркаваць абавязкі сярод комсамольцаў так, каб забясьпечыць упартую работу на асноўных вучастках.

У справе перабудовы мы маем значныя посьпехі. Аднак, у радзе месц праходзяць формальна, група яшчэ ня стала асноўнай фігурай у рабоце, асабліва гэта адносіцца да транспартнага комсамолу. Задача ў тым, каб усю работу перанесьці ў групу, узьняўшы яе ролю і гэтым дабівацца яшчэ большага ўздыму ролі КСМ у выкананьні задач соцбудаўніцтва.

Г. Фіялкін

МЕНСКІЯ ФАБЗАВУЧЫ ПРЫЙДУЦЬ ДА КАНФЭРЭНЦЫІ адзінай ударнай брыгадай

МЕНСКАЯ КОНФЭРЭНЦЫЯ ФЗВ СКОНЧЫЛА СВАЮ РАБОТУ

Скончылася гарадзкая конфэрэнцыя ФЗВ, якая прайшла пад шлакам рэалізацыі сталінскай пуцёўкі да ўсебеларускай конфэрэнцыі ФЗВ.

Конфэрэнцыя прыняла рад практычных мерапрыемстваў у далейшай рабоце ФЗВ.

Ажыцьцяўляючы гэтыя мерапрыемствы, менскія фабзавучы павінны разгарнуць яшчэ больш падрыхтоўку да ўсебеларускай конфэрэнцыі і прыйсьці да яе адзінай ударнай брыгадай.

Вялікую ролю ў гэтай падрыхтоўцы павінен адыграць нізавы друк. В таючы ініцыятыву рэдколегіі шматтыражкі „Нашы кадры", „Чырвоная зьмена" заклікае ўсе насьценгазэты, шматтыражкі і насьценгазэты ФЗВ адказаць на выклік КІМаўцаў разгортваньнем вялікай масавай работы вакол падрыхтоўкі да ўсебеларускай конфэрэнцыі фабзавучнікаў.

Што пастанавіла конфэрэнцыя

Зрабіць прадпрыемства цэнтральным месцам усёй грамадзка-палітычнай працы. Кожны фабзавуц павінен сумесна з усімі рабочымі прыняць актыўны ўдзел у рэалізацыі 6 умоў т. Сталіна і г. д.

Перанесьці цэнтр цяжару работы ФЗВ у цэх, не дапускаючы зьніжэньня ўвагі ў грамадзка-палітычным жыцьці не вырашэньня ўнутрышкольных задач (пляніраваньня, комплект, вучэбна-вытворчая работа, ўдарніцтва, правільная організацыя вольнага часу і г. д.

Абавязаць усе ФЗВ ўключыць у сыстэму грамадзка-палітычнага выхаваньня барацьбу за Менск, як горад суцэльнай пісьменнасьці, паскарэньне тэмпаў беларусізацыі, надаўшы асаблівую ўвагу вывучэньню экономікі, геграфі і гісторыі Беларусі, пасіліць работу сярод нацменшасьцяй, уцягнуць шырокія колы ФЗВ у літаратурную справу, прыцягнуўшы іх да стварэньня гісторыі фабрык і заводаў, паказаў герояў работы і вучобы.

У адпаведнасьці са зьменай форм і мэтодаў грамадзка-палітычнага выхаваньня конфэрэнцыя лічыць неабходным зьмену самай структуры вучнёўскіх організацый шляхам стварэньня саветаў брыгадзіраў, якія павінны зьвязаць работу школы з фабрычнай адміністрацыяй.

Конфэрэнцыя просіць рэдакцыю „Чырвонай Зьмены" організаваць сыстэматычны выпуск лістка фабзайпа.

Лепшыя прэміяваны

На першай гар. конфэрэнцыі ФЗВ былі падведзены вынікі конкурсу на лепшы ФЗВ г. Менску.

Першую прэмію—пераходны сьцяг—атрымала МШВ, другую прэмію—тэхнічную бібліотэку ў 300 руб.—ФЗВ „КІМ", трэцюю прэмію—15 гатавальняў—ФЗВ „Ударнік".

[illegible]азгарнеце вялікую падрыхтоўку

[illegible] ўсіх рэдкалегій шматтиражак, цэхавых насьценгазэт ФЗВ Беларусі

[illegible]рымаючы пад ўвагу вялікую ролю [illegible]вога друку ў падрыхтоўцы да [illegible]беларускай конфэрэнцыі ФЗВ, рэд[illegible]егіі шматтыражкі „Нашы кадры" [illegible] імя „КІМу" зварочваецца да вас, [illegible] шляхам соцспаборніцтва паставіць [illegible] працу на належную вышыню.

[illegible]ля гэтага мы пераводзім 10 на[illegible]енгазэт на штодзённы выпуск. Мы [illegible]ялі юнкораўскі рэйд з ўдзелам [illegible]Сал., якія організавалі 5 ўдарных [illegible]ігад імя „Усебеларускай конфэрэн[illegible]"

[illegible]ершая зьмена інструктароў, узяў[illegible] на сябе конкрэтныя абавязкі па [illegible]лу у падрыхтоўцы да конфэрэн[illegible] выклікала другую зьмену і на[illegible]нікаў. Па усіх цэхах організава[illegible] пасты юнкораў, якія штодзенна [illegible]рмуюць аб ходзе падрыхтоўкі да [illegible]рэнцыі. Мы лічым неабходным [illegible]есьці шырокую работу праз друк [illegible] пытаньню канчатковага акомса[illegible]ваньня нашага ФЗВ.

[illegible] лістапада мы склікаем конфэрэн[illegible] юнкораў, две будзе абгаворана [illegible]ньне аб ходзе падрыхтоўкі да [illegible]беларускай конфэрэнцыі ФЗВ.

[illegible]зам з юнкорамі нашага ФЗВ мы [illegible]рымліваем ініцыятыву дэлегатаў [illegible]гарадзкой конфэрэнцыі аб выпус[illegible] дэкаднай старонкі фабзайцаў у [illegible]рвонай Зьмене" і абавязваемся [illegible]лізаваць усіх юнкораў для актыў[illegible] ўдзелу ў ёй.

[illegible]ы выклікаем усе рэдколегіі на[illegible]енгазэт ФЗВ разгарнуць вялізар[illegible]шую падрыхтоўку да ўсебеларус[illegible] конфэрэнцыі і просім ВСНГ ад[illegible]ціць сьпэцыяльны фонд для прэ[illegible]ньня лепшай шматтыражкі і [illegible]сьценгазэты.

Рэдколегія шматтыражкі „Нашы кадры".

Організуем пераклічку ФЗВ

[illegible] ўсіх фабзавучнікаў, пэда[illegible]гічна-інструктарскага і ін[illegible]жынэрна-тэхнічнага пэрсоналу ФЗВ

([illegible]заклік гарадзкой конфэрэнцыі)

[illegible]енскія фабзавучы пад кіраў[illegible]іцтвам комсамолу ў парадку пад[illegible]рыхтоўкі да першай конфэрэнцыі [illegible] рашуча змагаліся за рэкон[illegible]струкцыю ФЗВ адпаведна з задачамі і тэмпамі соцыялістычнай рэконструкцыі ўсяе сыстэмы народнай гаспадаркі.

[illegible]енскія ФЗВ значна ўзьнялі [illegible]ьць і пляніраваньне тэорэтычнага [illegible]вучага навучаньня, шырока [illegible]разгарнулі соцспаборніцтва і ўдарніцтва, дасягнулі значных посьпехаў у вырашэньні баявых задач сучаснага пэрыоду.

[illegible]ключаючыся ў сталінскі паход [illegible] разгортваючы далейшую рэалізацыю сталінскай пуцёўкі і пастановы ЦК аб сярэдняй школе, мы пры[illegible] да 1-й усебеларускай конфэрэнцыі ФЗВ поўнасьцю падрыхтаванымі.

[illegible]ачынаючы зараз сталінскі паход, конфэрэнцыя выклікае ўсе ФЗВ наладзіць шырока абмен вопытам работы і прапануе організаваць пераклічку ФЗВ.

1-ая агульнагарадзкая конфэрэнцыя ФЗВ г. Менску

Узьняць энтузіязм мас колгасьнікаў і аднаасобнікаў

Па-ўдарнаму організаваць пераапрацоўку і здачу дзяржаве ільнаваланна

Усім РК КП(б)Б

На падставе пастановы ЦК (апублікаванай ў газэце „Зьвязда" да 4 IX-32 г.) РК КП(б) і КСМ, фр. РВК, райколгассаюзам, партчасткам і загатоўчым організацыям ЦК прапануе ажыцьцявіць наступныя мерапрыемствы:

1. Абгаварыць пастанову ЦК аб першапачатковай апрацоўцы ільна і канапель на пасяджэньні РК, ячэек КП(б)Б і КСМ, правесьці раённыя нарады сэкратароў партыйных і комсамольскіх ячэек, старшынь с-с і колгасаў, раённага партыйнага, савецкага і кооперацыйнага актыву, дзе распрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы па выкананьню пастановы ЦК КП(б)Б.

2. Райкомам КП(б)Б і ячэйкам разгарнуць шырокую організацыйна-масавую работу сярод колгасьнікаў і колгасьніц, рабочых саўгасаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў, шляхам абгаварэньня рашэньняў ЦК на праўленьнях колгасаў і агульных сходах колгасьнікаў беднякоў і серадвякоў аднаасобнікаў.

3. Абгараваючы практычныя мерапрыемствы па выкананьню пастановы ЦК і мясцовых парторганізацый сярод рабочых саўгасу, колгасьнікаў, беднякоў і серадвякоў аднаасобнікаў, праводзіць практычную работу па пераводу ільнаводных колгасаў на здзельшчыну, організаваць соцспаборніцтва паміж паасобнымі раёнамі, колгасамі, вёскамі і брыгадамі колгасьнікаў і аднаасобнікаў, а таксама стварэньне ў колгасах, саўгасах ударных брыгад па апрацоўцы і здачы ільна і канапель, асобна організоўваючы ўдарныя брыгады па апрацоўцы экспортнага лёну, забясьпечыць удзел усіх колгасаў, МТС, саўгасаў у конкурсе на лепшую апрацоўку і здачу дзяржаве ільнавалакна і пянькі (абвешчана ў газэце „Зьвязда" №254).

4. РК і ячэйкі КП(б)Б і КСМ, фракцыі РВК, райколгассаюзы і МТС павінны зараз-жа вызначыць тыя ільнізаводы, з якімі саўгасы, колгасы і МТС будуць заключаць соцумовы, правесьці супольныя нарады, дзе распрацаваць конкрэтныя абавязацельствы з перанясеньнем дэталёвай выпрацоўкі і заключэньня соцумоў на сходы рабочых саўгасаў, колгасьнікаў, рабочых МТС і аднаасобнікаў. Сондагаворы павінны прадугледзіць аказаньне дапамогі прамысловасьцю колгасам, саўгасам, і МТС, шляхам інструктаваньня аб лепшай першапачатковай апрацоўкі ільну, пасылкі рабочых брыгад і г. д. З другога боку, саўгасы, колгасы і МТС павінны па дагаворах з прамысловымі прадпрыемствамі прыняць абавязак па сваячасовай апрацоўцы ільна і канапель, датэрміновай здачы, (продажу) дзяржаве, а таксама прадугледзець добраякасную здачу сыравіны.

5. Фракцыі РВК, РКК РСІ і райколгассаюзам, загатоўчым організацыям зараз-жа скласьці брыгады з прадстаўнікоў РВК, РКК РСІ райколгассаюзаў, саўгасаў, колгасаў і МТС і загатоўчых організацый, якія павінны праверыць наступнае:

а) Падрыхтаванасьць у кожным колгасе мяльнасушыльных пунктаў і будаўніцтва новых,

Гатоўнасьць ільназаводаў да прыёмкі трасты, а таксама сваячасовы пуск заводаў, організоўваць дапамогу колгасьнікаў у сваячасовым скончэньні будаўніцтва заводаў.

б) Організаванасьць брыгад па мяцьцю, сушцы і трапаньню трасты, давядзеньне да кожнай брыгады нормы в працоўкі, дача сутачнага заданьня па пераапрацоўцы трасты ў гатовае ільнавалакно і пяньку, зьнішчыць абязьлічку праз прымацаваньне да брыгад інвэнтара. На чале брыгад неабходна ставіць колгасьнікаў ударнікаў, якія праявілі сябе ў веснавую ўборачную кампанію па пасеву і ўборцы лёну. РК фр, РВК райколгассаюз м, МТС забясьпечыць ня менш як 2-х зьменную конвэерную брыгадную работу па апрацоўцы льна і канапель.

в) Давядзеньне да кожнага колгасу плянаў пераапрацоўкі і плянаў здачы ільнавалакна і пянькі дзяржаве, складаньне рабочых каляндарных плянаў па-за заводзкай апрацоўкі ільна і канапель і шырокае абгаварэньне сярод колгасьнікаў і колгасьніц вызначаных норм выпрацоўкі. Давядзеньне плянаў да вёсак і двара ў парадку самаабавязацельства, зьвярнуўшы асабліва сур'ёзную ўвагу на праверку выкананьня цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі.

6. Разгарнуць шырокую масавага организацыйную работу па мобілізацыі мас колгасьнікаў, колгасьніц, беднякоў і серадвякоў аднаасобнікаў на праведзеньне чырвоных абозаў.

7. З мэтай атрымаць лепшай якасьці ільнавалакно і пяньку, павесьці працу сярод колгасьнікаў, колгасьніц, беднякоў і серадвякоў аднаасобнікаў за сваячасовы пад'ём трасты са сьцелішч і выемку з мачыльных ям. Неабходна шырока популярызаваць і правесьці ў жыцьцё пастанову НКЗ БССР і Белколгасцэнтру аб організацыі працы мяльшчыкаў, трапальшчыкаў і сушыльшчыкаў.

8. Пры організацыі пераапрацоўкі ільна і канапель і здачы іх бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі разгарнуць працу па узаемадапамозе колгасам з боку аднаасобнікаў беднякоў і серадвякоў і наадварот. Шырока растлумачыць ільготу пасеўшчыкам ільна і канапель згодна пастанове ЦК ад 22 IX-31 г.

9. На усіх прыёмачных пунктах забясьпечыць культурна масавае абслугоўваньне колгасьнікаў, колгасьніц беднякоў і серадвякоў

10. Скласьці брыгады з прадстаўнікоў ЦКК РСІ (кіраўнік брыгады НКЗ і рэдакцый газэт „Зьвязда", „Савецкая Беларусь", „Колгасьнік Беларусі", якім праверыць на працягу дэкады выкананьне пастаноў ЦК і ўраду па прасоўваньню прамтавараў па стымуляваньні апрацоўкі і нарыхтоўкі ільна і канапель і забясьпечаньню хлебам пасеўшчыкаў і здатчыкаў.

11. Сэктару друку культпропу ЦК правесьці нараду прадстаўнікоў рэдакцый цэнтральных газэт па распрацоўцы практычных мерапрыемстваў для выкананьня пастаноў ЦК аб ільназагатоўках з боку цэнтральных і мясцовых газэт.

12. Заслухаць у бліжэйшы час 3 сэкратараў райкомаў аб ходзе першапачатковай па-за заводзкай апрацоўкі ільна і канапель і здачы продукцыі дзяржаве.

13. Для практычнага кіраваньня месячнікам скласьці штаб з прадстаўнікоў агітмасавага аддзелу ЦК, НКЗ. Наркомснабу, рэдакцыі, ЦК ЛКСМБ. Райкомам КП(б)Б стварыць раённыя штабы для кіраваньня практычнай работай па правядзеньню месячніка.

ЦК КП(б)Б.

На Савецкай, 119 пачалася „бойка"

Стары, нявольніцкі быт—наш вораг

Мобілізуйцеся на рэалізацыю 6-га маршруту сталінскага паходу!

У палепшаньні быту пролетарскага студэнцтва мы маем значныя дасягненьні. З кожным днём павялічваецца жыльлёвая плошча, організоўваюцца інтэрнат за інтэрнатам. Паляпшаюцца, асабліва ў апошні час санітарныя ўмовы гэтых інтэрнатаў.

Аднак, мы маем яшчэ рад недахопаў у справе бытавога абслугоўваньня студэнтаў, часам яшчэ ганебна мала ўвагі зьвяртаем на іх культурна-бытавое абслугоўваньне.

Комсамол навучальных установаў павінен шчыльна падыйсьці давырашэньня культурна-бытавых пытаньняў, да конкрэтнага ажыцьцяўленьня задач, пастаўленых т. Сталіным і комсамольскім сталінскім паходам.

Усе комсамольскія організацыі павінны падхапіць ініцыятыву студэнтаў—жыхароў першага пакою інтэрнату Менскага Белпэдтэхнікуму па Савецкай 119, павінны пасьледваць іх прыкладу і павесьці бязьлітасную барацьбу за чысты ложак, чысты пакой, чыстую сталоўку і цэх, за організацыю пры кожным прадпрыемстве, колгасе, саўгасе і навучальнай установе лазьні і пральні.

Мы можам і павінны жыць у значна лепшых умовах, чым жывём зараз. Бо справа паляпшэньня нашых культурна-бытавых умоў—справа самых нас.

Іду ў атаку!

Абвяшчаю сябе ўдарнікам 6-га маршруту сталінскага комсамольскага паходу

VI маршрут сталінскага комсамольскага паходу „за соцыялістычны быт" ставіць перад кожным комсамольцам конкрэтныя абавязк. Кожны комсамолец, кожны малады рабочы павінен ударна ўзяцца за ажыцьцяўленьне гэтага маршруту.

Я, студэнт 2-га курсу Менскага беларускага пэдагогічнага тэхнікуму абвяшчаю сябе ўдарнікам 6-га маршруту сталінскай комсамольскай пуцёўкі 4-га заключнага.

Для конкрэтнага ажыцьцяўленьня 6-га маршруту сталінскай пуцёўкі, організую па першаму пакою інтэрнату (Савецкая, 119) паход за чыстату.

Іду ў апошні бой з блыхамі і клапамі.

Іду ў бой супроць антысанітарыі, супроць безгаспадарнасьці і расхлябанасьці ў інтэрнаце, супроць вашэй якія ў нас знаходзяць яшчэ прытулак з-за таго, што мы не можам акуратна мыць бялізну (пральня не насьпявае).

Выклікаю пасьледваць майму прыкладу студэнтаў жыхароў—інтэрнату МБПТ на Савецкай 119.

Давайце сумесна ачысьцім ад бруду, ад нячыстот, блох, клапоў нашы пакоі. Прывядзем іх у парадак

Давайце сумесна даб'ёмся організацыі пры тэхнікуме пральні

Давайце сумесна, ўдарна возьмемся за выкананьне задач, пастаўленых перад намі 6-цю маршрутамі сталінскай пуцёўкі.

Еленьчык

Кавалевіч, Сабалеўскі і Еленчык

Патрабуем умяшаньня прокурора

На будаўніцтве сьвінарнікаў у саўгасе „Зара Захаду" Трасноўскага сельсавету (Заслаўскі раён) раней працавала 150 цесьляроў. Цяпер з-за недапушчальных бытавых умоў, у якіх знаходзіліся рабочыя засталося толькі 25 чалавек. Рэшта „ўлятучыліся".

Будаўніцтва далёка яшчэ не закончана. Пабудавана ўсяго 4 сьвінарнікі, засталося будаваць яшчэ —13.

Прымаем выклік Еленьчыка

Выступаем ва ўдарны паход

Абгаварыўшы выклік тав. Еленьчыка па конкрэтнаму ажыцьцяўленьню сталінскай комсамольскай пуцёўкі мы, юнкоры-ўдарнікі „Чырвонай зьмены", студэнты МБПТ, жыхары 1-га пакою выклік прымаем і выступаем ва ўдарны паход за ажыцьцяўленьне задач сталінскай пуцёўкі—паходу. Абвяшчаем сябе ўдарнікамі па ажыцьцяўленьні 6-га маршруту.

Абавязуемся:

Выканаць усе высунутыя тав. Еленьчыкам пункты і змагацца за іх хутчэйшае ажыцьцяўленьне.

З свайго боку, як ударнікі друку абавязваемся сыстэматычна асьвятляць у насьценгазэтах тэхнікуму і „Чырвонай зьмене" ход і рэалізацыі ў нашай установе сталінскай комсамольскай пуцёўкі, множыць лепшыя ўзоры барацьбы за лепшае культурна-бытавое абслугоўваньне пролетарскага студэнцтва.

Заклікаем на штурм выкананьня 6-га маршруту сталінскай комсамольскай пуцёўкі студэнтаў жыхароў астатніх пакояў інтэрнатаў Белпэдтэхнікуму і жыхароў інтэрнатаў Менскіх Яўрэйскага і Польскага пэдтэхнікумаў.

Ударнікі „Чырвонай зьмены" студэнты МБПТ жыхары 1-га пакою інтэрнату, па Савецкай 119.

Кавалевіч Сабалеўскі, Тарашкевіч. Мазоўка, Кашэль і Парфіяновіч

Генэрал Ма патрабуе вываду японскіх войск

Умовы генэрала Ма

МУКДЭН. 18. Па паведамленьню з японскіх вайсковых колаў генэрал Ма накіраваў генэралу Сонцзіо адказ у якім ён піша, што згодны эвакуіраваць свае войскі ў тым выпадку, калі Японія першай выведзе свае войскі. Генэрал Ма ставіць яшчэ ўмовы аб гарантаваньні руху Таонань-Анандзінскай чыгункі і спыненьня руху японскіх войскаў па гэтай чыгунцы.

Прадстаўнік японскіх вайсковых колаў комэнтуючы адказ генэрала Ма адказаў: „мы напэўна адхілім гэты адказ". Гэта выклікала вялікае зьдзіўленьне замежных корэспондэнтаў, якія лічаць што адказ генэрала Ма складае прадпасылкі дзеля таго, каб распачаць з ім дагаворы і дасягнуць компрамісу.

Нанкінскі ўрад папераджае

ШАНХАЙ. Нанкінскі ўрад папяраджае, што калі будзе ўтвораны манархічны ўрад, дык Кітай будзе яго расьцэньваць як „надзейны ўрад" організаваны японцамі і што па гэтаму адказнасьць за дзеяньні гэтага ўраду ляжа на японцаў.


Губэрнатарам прызначаны генэрал Ма

ШАНХАЙ. 18. Нанкінскі ўрад прыняў адстаўку губэрнатара Хэй-Лундзянскага ўраду Ван-Фу-Ліна і прызначыў замест яго генэрала Ма.

Фінансавыя цяжкасьці гарадзкога самакіраўніцтва на плячох рабочых

ВАРШАВА. 16. Учора на паседжаньні варшаўскага магістрату аб гаварвалася пытаньне аб забастоўцы трамвайшчыкаў. Некалькі згодніцкіх профсаюзнікаў выступілі на паседжаньні з „гарачымі прамовамі" за падтрыманьне патрабаваньняў рабочых магістратаў. Прэзыдэнт гораду Гамінскі даў даведку аб тым, што профсаюзныя правадыры яшчэ з 2 гадзіны дня раіліся ў міністэрстве працы аб тым, як лепш ліквідаваць стачку. К 9 гадзіне ўвечары яны падпісалі пратакол аб ліквідацыі конфлікту на рашэньне ўрадавага арбітражу.

Згодніцкі прынялі запатрабаваньне інспэктара працы аб неадкладным спыненьні забастоўкі. Прадстаўнікі магістратаў у сваю чаргу абяцаюць ня ўжываць у лістападзе паніжаную зарплату. У сувязу з гэтым прэзыдэнт гораду прапанаваў магістрату ўстрымацца ад рэзалюцыі. Аднак магістрат зразумеў тонкія манэўры прафсаюзьнікаў і для палегчаньня плённай працы прыняў у якасьці „пажаданьня" прапанову задавальненьня запатрабаваньні рабочых аб узвядзеньні чэрвеньскіх ставак. Сёньняшнія газэты ўказваюць, што пастанова думы не зьяўляецца абавязковай для магістратаў і ня можа быць ажыцьцяўлена ў сувязку з фінансавымі цяжкасьцямі гарадзкога самакіраўніцтва.



Французскія параходы стаяць без работы з-за атсутнасьці грузаў

Гаспадарчаму разрахунку—пропуск у гуту

ЗА механізацыю шкляной вытворчасьці замацаваньне рабочай сілы, поўнае ажыцьцяўленьне сталінскай пуцёўкі

Пасьпяховае выкананьне пляну 3-га году пяцігодкі шкляной прамысловасьці залежыць ад таго наколькі партыйныя, профсаюзныя і комсамольскія організацыі здолеюць праламіць у жыцьцё указаньні Сталіна, паставіць барацьбу за механізацыю вытворчасьці і замацаваньне рабочай сілы ў цэнтр сваёй работы.

Лісты нашых юнкораў з гут сьведчаць аб тым, што гэтыя пытаньні яшчэ не ўзяты ў аснову ўсёй работы заводскай грамадзкасьці.

Патрэбен пералом. Комсамольскія організацыі шклозаводаў павінны забясьпечыць найхутчэйшую рэалізацыю сталінскай пуцёўкі, а гэта значыць дабіцца праўдзівага ажыцьцяўленьня гаспадарчага разрахунку, лепшай механізацыі вытворчасьці і замацаваньня рабочай сілы за прадпрыемствамі.

Гэтыя ўмовы вырашаюць посьпехі. За іх неабходна змагацца.

На базе гаспразрахунку павялічваем вытворчасьць працы

На шклозаводзе „Кастрычнік", Асіпавіцкага раёну, на працягу 3-х кварталаў меў месца прарыў.

На працягу трох кварталаў не аддавалі належнай увагі соцспаборніцтву і гасразрахунку нават інжынерна-тэхнічныя працаўнікі.

Настаў час, калі рабочыя задумаліся рашуча з гэтым пакончыць. Укараненьне гаспадарчага разрахунку ў працы брыгад, цэхаў і варштатаў зрабілася адным з галоўнейшых пытаньняў працы заводскай партыйнай, комсамольскай і профсаюзнай організацый і ўсяго колектыву рабочых.

Арганізацыя зрабілася не бясплоднымі метадамі павышэньня вытворчасьці працы. Першымі выступілі рабочыя 4-й зьмены выдувальнага цэху. Яны выпусьцілі адозву, у якой заклікалі астатніх рабочых перайсьці на ўдарныя рэйкі.

Пастанова была абмеркавана на ўсіх зьменах, рабочых ўсіх варштатаў. У выніку—узрасьлі рады ўдарнікаў. Зараз некаторыя варштаты пачалі перавыконваць плян выпуску, выпусьціўшы прадукцыю лепшай якасьці.

Бюро партколектыву, а сумесна з ім і комсамольская організацыя, па-бальшавіцку ўзяліся за ўкараненьне гасразрахунку, за выкананьне 6 умоў т. Сталіна.

Зараз на шклозаводзе „Кастрычнік" на гасразрахунак пераведзены



Тав. Сарокін каля сконструяванай ім машыны

ўсе комсамольскія брыгады выдувальнага цэху.

На агульна-заводзкім сходзе рабочыя заводу абяцалі аддаць краіне запазычанасьць, якая ўтварылася у мінулыя месяцы з прычыны недавыкананьня прамфінпляну.

Кузьменка, Сямёнаў.

Блытаніну з у[...] раненьнем гаспра[...] рахунку трэба зы[...] шчыць

Шклозавод „Ноўка", Сура[...] раёну, цалкам перайшоў на га[...] рахунак. Але, праверсьці заво[...] гасразрахунак і організавац[...] ўкараненьне ва ўсіх цэхах, бр[...] дах і варштатах так, каб ад[...] га павялічвалася продукцыйна[...] працы і якасьць продукцыі—[...] рэчы проціжеглыя.

На заводзе „Ноўка" выйш[...] раз так, што на гасразрахуна[...] райшлі, але не навучылі рабо[...] як конкрэтна ажыцьцяўляць[...]

Ніводзін рабочы, а нават і [...] торыя работнікі з адміністрацы[...] тэхнічнага пэрсоналу ня вед[...] аб тым, як ажыцьцявіць гасра[...] хунак. У час працы пушчаюц[...] ход усе варштаты, нават т[...] калі не да ўсіх хапае рабочых[...] варштатаў гараць гарэлкі, б[...] казна выдаткоўваецца энэргі[...] не занятыя варштаты псуюцца[...] прынесячы ніякай карысьці[...] экономным скарыстаньні газ[...] бэнзыны ніхто не задумваецца.

У дадатак на заводзе не ра[...] нальна растаўлена рабочая [...] Адміністрацыйна-тэхнічны пэрс[...] аб гэтым ня дбае. Часта кіраў[...] цэхаў, бегаючы па заводзе, [...] раюць рабочых, зьнімаюць іх з [...] най працы і перакідаюць на ін[...] што вельмі дрэнна адбіваецца [...] выкананьні прамфінпляну.

Партыйнаму і комсамольс[...] колектывам, а таксама заводз[...] камітэту неабходна тэрмінова [...] працаваць пытаньне аб укаран[...] ні на заводзе гаспадарчага раз[...] хунку, давесьці яго да кож[...] цэху, варштата і брыгады, орг[...] заваць рад гутарак для рабочы[...] мэтай растлумачыць спосабы ў[...] раненьня гасразрахунку і ўжыван[...] ўнутрызаводзкага і ўнутрыц[...] вага накапленьня.

Эка[...]

Нам. адказн. рэдактара С. АНК[...]

Портрэты дэзэртыраў

ФЭЛЬЕТОН ТАВ. ШВЭЙДЭЛЯ

(Рабочы-ўдарнік, заклікаHы ў літаратуру)

На судзе яны трымалі сябе не аднолькава. Кожны з іх абраў свой мэтод абароны і ўвесь час не зьмяняў яго. У кожным адказе на запытаньні, у рэпліцы і, нарэшце, ў апошнім слове перад судом адчуваўся вораг, адчувалася варожая ідэолегія. І суд, рабочая грамадзкасьць друкарні ім. Сталіна, добра зразумелі гэта.

* * *

Кацовіч Ільля абраў „пасыўны" мэтод абароны. Гаворыць ён ціха, пытаньня як быццам не разумее, наогул ён лічыць, што яго прысутнасьць тут на судзе,— нейкая памылка. „Я не я—і хата не мая". Але на судзе выяўлена:

Кацовіч І. да таго, як паступіў вучнам у наборны цэх друкарні імя Сталіна займаўся ў фабзавучы кулінараў. Рыхтаваўся ён на повара ў гэтым фабзавучы і раптам прыйшоў да думкі: „не, повар з мяне не атрымаецца, трэба кінуць гэту справу". І кінуў. Кінуў і пайшоў вучыцца у наборны цэх друкарні. Тут-жа ён уступіў у комсамол. Але пачэснае званьне комсамольца ён ужо з самага пачатку пачаў ганьбіць. Грамадзкая праца—асноўны абавязак комсамольца,—у яго не ў пашане.

Усе мусіць памятаюць напружанае становішча з рабочай сілай на торпараспрацоўках. Апал—тое, чаго не хапала нашым фабрыкам, заводам, электростанцыям,—апал трэба было дастаць. Комсамол Беларусі мобілізаваў сваіх членаў у торпяны Донбас.

Калі ячэйка прапанала Кацовічу ехаць на самы фронт, ён ня доўга размаўляючы, адмовіўся. Прычыны? Разумейце: ён павінен трымаць іспыты ў Музтэхнікум. Асноўныя гэта і нельга ячэйцы лезьці да яго з „нейкімі" торпараспрацоўкамі. Нашлі дурня!

Бюро ячэйкі вынесла яму толькі вымову. Праз некалькі месяцаў Кацовіч скончыў ШУМП і пайшоў працаваць у цэх. І раптам...

— Падсудны Кацовіч, чаму вы самавольна пакінулі працу?

— Бачыце: я.. я палічыў, што з мяне выйдзе дрэнны наборшчык, дык я пайшоў у музтэхнікум. Я да музыкі здольны.

— А калі комсамольская ячэйка не адпусьціць вас?

— А? не разумею...

— Калі вас, комсамольца, ячэйка не адпусьціла-б з прадпрыемства, ці згадзіліся-б з гэтай пастановай?

— Гм.., я... не тарырышы, я да музыкі...

* * *

Алесь Розна.

Колькі гонару, колькі фанабэрыі у яго, Розна—які ўвесь час патрабаваў грамадзкага суду, лічачы, што пастанова бюро комсамольскай ячэйкі для яго не аўтарытэт,з якой пагардай адносіцца да гэтага суду. Ён падсудны? Наадварот! Ён вам пакаж „кузькіну маць".

У наборным цэху яго ведаюць, як пісьменьніка. Мо' думаеце, ён сваёй творчасьцю ў насьценгазэце, у шматтыражцы заклікаў на барацьбу за прамфінплян, сваімі вершамі дапамагаў ліквідаваць прарыў? Як мала вы разумееце ролі „поэты", таварышы.

Хіба гэта яго справа займацца штодзённым жыцьцём цэху? Няхай гэтым іншыя займаюцца літгурток ці такія як Лейбман і Малашэнка ударнікі у літаратуры—аўтары кніжкі „Новы цэх варашылаўцаў", Вось напісаць зборнік экстэтычных вершаў, за які ДВБ схопіцца абедзьвума рукамі, (да рэчы: зацікаўнасьць ДВБ у выпуску творніку ўдарнікаў, заклікаHых у літаратуру, адваротна пропорцыянальна зацікаўленасьці ў выпуску кніжкі дэзэртыра Алеся Розны—Рознэрта), вось гэта напісаць гэта так! Тым больш што за іх плацяць ня дрэнныя грошы.

На прадпрыемстве, куды прышоў Рознэрт (Розна,) выключаны з пэдтэхнікуму дамагаўся па сваёй заяве;

– Вывучыць прадпрыемства, рабочых.

Па думцы грамадзкага суду;

— Набыць вытворчы стаж. каб потым спэкуляваць ім.

І сапраўды: не пасьпеў ён пагрэць рукі у цэху пасьля сканчэньня ШУМП'у, як ні ў кога ня пытаючыся,—ні у адміністрацыі, ні ў комсамольскай ячэйкі,—пайшоў займацца на газэтна выдавецкае аддзяленьне пэдінстытуту. Бо:

Патрэбны пэдагогічныя кадры. У інстытуце не хапае людзей.

Ня інакш, як рабочы колектыў друкарні павінен вынесьці падзяку Рознэрту за тое, што ён заняў пустуючае месца ў інстытуце.

Як жа; змагар на пэдагогічным фронце. Вы сабе уяўляеце гэта так: для пэдінстытуту няма людзей. І вось прыходзіць адважны Рознэрт, чалавек „без страха и упрека" і ахвяруе сябе на пэдагогічную дзейнасьць. Таварышы вы разумееце...

Але Рознэрт яшчэ ня скончыў сваю прамову. Яго красамоўнасьць патрабуе для сябе новых об'ектаў:

— Прадпрыемства для моладзі—гэта прахадны двор. Гэта...

— Трапло, ты, трапло!—сказаў стары рабочы машыннага цэху, які прысутнічаў на судзе.

— Вораг—гаворым мы,—вораг гаворыць вуснамі дэзэртыра Рознэрта.

* * *

„... Улічваючы усё вышэй адзначанае, грамадзкі суд над дэзэртырамі вытворчасьці—Кацовічам І. і Рознэртам Алесем пастанаўляе:

1. Прасіць бюро колектыву комсамола друкарні імя Сталіна выключыць Кацовіча і Рознэрта А. з організацыі.

2. Прасіць ФЗК друкарні выключыць Кацовіча і Рознэрта з профсаюзу.

3. Прасіць колегію Наркомасьветы выключыць са складу вучняў Музтэхнікуму Кацовіча І. і са складу студэнтаў газэтна-выдавецкага аддзяленьня пэдінстытуту Рознэрта А.".

Так вырашыў грамадзкі суд друкарні ім. Сталіна.

Сёньня

а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні саўгасу „Лекерта" адбудзецца паседжаньне Аб'яднанага Бюро Скаргаў ЦК НК РСІ Бел. з разглядам наступных спраў:

1. Справа б. бухгальтара саўгасу „Лекерта" т. Кавалевіча;

2. Заява вучняў школы саўгасу.

Усе прадстаўнікі, якіх гэтыя справы датычаць, павінны зьявіцца. Выклікаюцца рабочыя засядацелі: Шуткін, Макеўшчык, Камароўская, Цэгла, Данкоўскі—Войлачная фабрыка: Бурак, Барбук, Цытрон, Янчук—„Хлебазавод", Драздовіч, Гурэвіч—зав. „Ударнік".

Запрашаецца актыў і „Л. К.

Заг. Аб'ядн. Бюро Скаргаў НК РСІ Бел. Матусевіч

а 6 гадз. ўвечары, у залі седжаньня ЦК склікаецца рада кіраўнікоў аддзелаў [...] раў і адказных па вучоту [...] раў (комуністых) наркомат[...] і цэнтральных установ, [...] наступных пытаньнях:

1. *Аб правядзеньні комэн[...] турнай сыстэмы ў разьм[...] каваньні кадраў;*

2. *Аб падрыхтоўцы да [...] беларускай -нарады па [...] рах.*

Яўка абавязкова без спа[...] неньня.

Турлай.

Згодна пастановы сэкратарыяту ЦК П(б)Б, 1-га сьнежня склікаецца 1-я ўсебеларуская партыйная нарада па мастацтву. Парадак дня:

1. Уступнае слова загадчыка Кульпропам ЦК—т. Чарнушэвіча;
2. Задачы мастацтва ў рэконструкцыйны пэрыод—даклад т. Платуна;
3. Аб пляне разьвіцьця мастацтва і падрыхтоўцы кадраў даклад Галоўмастацтва;
4. Аб становішчы і далейшых задачах разьвіцьця тэатраў БССР—даклад т. т. Вольскага і Канакоціна;
5. Аб становішчы і далейшых задачах разьвіцьця опэры і музыкі ў БССР—даклад т. т. Гідгарца, Казакова і Любана;
6. Аб выяўленчым мастацтве—даклад т. Гаўрыленка;
7. Шляхі разьвіцьця кінэматографіі ў БССР—даклад т. т. Раманчука і Галкіна;
8. Трамы і самадзейнае мастацтва—дакл. т. т. Клімковіч і Шамшура.

На нарадзе будуць працаваць сэкцыі па асобных галінах мастацтва пры ўдзеле партыйнага і комсамольскага актыву працаўнікоў мастацтва гор. Менску.

Нам. Заг. Культпропам ЦК КП(б)Б Залатухін.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.